Б-172

# Заслужанаму дзеячу навукі — акадэміку Нікольскаму большэвіцкае прывітанне!

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

За ленінскія кадры

Орган Парткома і Прафкома Беларускага Дзяржаўнага Універсітэта

№ 3 — 29 мая 1935 г. — № 3

## Жыццё і дзейнасць акадэміка Н. М. Нікольскага.

Сёння навуковыя ўстановы, ВНУ, і грамадскія арганізацыі праводзяць чэстваванне акадэміка Нікольскага ў сувязі з 35-гадовым юбілеем яго навукова-педагагічнай дзейнасці і наданнем яму Совнаркомам БССР звання заслужанага дзеяча навукі рэспублікі.

У 1900 годзе акадэмік Нікольскі скончыў гісторыка-філалагічны факультэт Маскоўскага Універсітэта і ў гэтым-жа годзе быў астаўлен пры універсітэце аспірантам. З гэтага часу і пачалася яго навуковая дзейнасць.

Да Окцябрскай рэволюцыі 1917 г. Нікалай Міхайлавіч працуе, галоўным чынам, у навуковых таварыствах—Маскоўскім Педагагічным таварыстве, Маскоўскім археалагічным таварыстве. у таварыстве імя Чупрова. У гэтых таварыствах тав. Нікольскі выступае з цэлым радам навуковых дакладаў па пытаннях гісторыі Ізраіля і гісторыі рэлігіі. Па гэтых-жа пытаннях Нікалай Міхайлавіч друкуе рад артыкулаў. Яго артыкулы аб рэлігіі, аб хрысціянстве, аб хрысце з'яўляюцца ў энцыклапедычным слаunion Граната (т. 36 і 45). Да рэволюцыі тав. Нікольскі супрацоўнічае з М. Н. Пакроўскім. У 4-х томніку гісторыі Пакроўскага друкуюцца раздзелы тав. Нікольскага аб рэлігіі і царкве ў Расіі. Разам з гэтай дзейнасцю акадэмік Нікольскі вядзе і выкладчыцкую работу, чытаючы курсы гісторыі ў сярэдніх школах. Трэба адзначыць, што ўжо да Окцябрскай рэволюцыі акадэмік Нікольскі сваімі работамі і сваёй навуковай і педагагічнай дзейнасцю аказвае рабочаму класу вялікую дапамогу ў яго рэволюцыйнай барацьбе. Па свайму светапогляду ён ад эканамічнага матэрыялізма пераходзіць к марксізму.

Трэба падкрэсліць, аднак, што толькі пасля Окцябрскай рэволюцыі, ва ўмовах Совецкай улады ва ўсёй сваёй шырыні і паўнаце разгортваецца навуковая і педагагічная дзейнасць акадэміка Нікольскага. Окцябрская рэволюцыя адкрыла шырачайшыя перспектывы ў справе сапраўднай навукі, пролетарскай навукі. Нікалай Міхайлавіч належыць да той групы старых вучоных, якія з першых-жа гадоў існавання Совецкай улады сталі работаць у інтарэсах пролетарыята.

Пасля Окцябра тав. Нікольскі на працягу 1918—21 гг. працуе ў Смаленскім універсітэце, а з 1921 г. і да сёнешняга дня знаходзіцца і працуе ў БССР, у Менску. У першыя гады пасля рэволюцыі ён не толькі чытае курсы ў вышэйшых школах, але і займае адміністрацыйна-кіруючыя пасады ў ВНУ, прымае актыўны ўдзел у арганізацыі першых вышэйшых школ. Да 1929 года яго дзейнасць з пераездам у Менск канцэнтрыруецца ў БДУ і педагагічным інстытуце. З 1929 г. тав. Нікольскі пераносіць цэнтр цяжару сваёй работы ў Акадэмію Навук. У 1931 годзе, пасля ачышчэння БелАН ад нацдэмаў і нацдэмаўскага



кіраўніцтва Нікалай Міхайлавіч збіраецца сапраўдным членам (акадэмікам) Беларускай Акадэміі Навук.

З адкрыццём гістарычнага факультэта БДУ акадэмік Нікольскі побач з работай у Акадэміі працуе і на факультэце, вядзе тут курс гісторыі старажытнага свету і рыхтуе аспірантуру па гэтаму прадмету.

За перыяд совецкай улады акадэмік Нікольскі напісаў і надрукаваў дзесяткі навуковых работ па пытаннях гісторыі рэлігіі, гісторыі рускай царквы, старажытнаму свету, этнаграфіі. У справе барацьбы з рэлігійным мракабессем, яўрэйскім, і беларускім нацыяналізмамі, у справе барацьбы за матэрыялістычны марксісцкі светапогляд яго работы маюць выключнае значэнне. Акадэміка Нікольскага, як вучонага, ведае не толькі ўвесь наш Совецкі Саюз, але яго ведаюць і ў капіталістычных краінах.

Надзвычай вялікай увагі заслугоўвае апошняя работа акадэміка Нікольскага па пытанню старажытнага свету і этнаграфічныя работы, у якіх выкрываюцца ўстаноўкі беларускіх нацдэмаў.

Будзем спадзявацца, што навуковая і педагагічная дзейнасць акадэміка Нікольскага яшчэ больш шырока будзе разгортвацца ў далейшым на карысць соцыялістычнага будаўніцтва.

**У дзень 35-гадовага юбілея пажадаем Нікалаю Міхайлавічу доўга жыць і пладатворна работаць у інтарэсах дыктатуры пролетарыята і будаўніцтва соцыялізма.**

Акадэмік В. К. Шчэрбакоў.

## АКАДЭМІКУ Н. М. НІКОЛЬСКАМУ

### Прывітанне ЦК КП(б)Б

Цэнтральны Камітэт Комуністычнай Партыі (большэвікоў) Беларусі вітае Вас, заслужанага дзеяча навукі рэспублікі, з 35-ці годдзем Вашай навукова-даследчай і педагагічнай дзейнасці. Жадаем Вам далейшай пладатворнай работы на карысць дыктатуры пролетарыята і соцыялістычнага будаўніцтва, на карысць вялікай соцыялістычнай радзімы.

ЦККП(б)Б.

### Прывітанне ЦВК БССР

Вітаю Вас з 35-ці годдзем Вашай навуковай, педагагічнай і грамадскай дзейнасці. Адзначаючы Вашу аддданасць справе соцыялістычнага будаўніцтва, Вашу прадукцыйную навуковую работу ў галіне гістарычнай навукі і падрыхтоўку большэвіцкіх гісторыкаў Совецкі Урад узнагародзіў Вас званнем заслужанага дзеяча навукі.

Жадаю Вам яшчэ доўгай плодатворнай работы на карысць працоўных нашай Совецкай краіны.

Старшыня ЦВК СССР і БССР
А. ЧЭРВЯКОЎ.

### Прывітанне Соўнаркома БССР

Совет Народных Камісараў Беларускай ССР у дзень 35-ці гадовага юбілея Вашай навуковай і педагагічнай дзейнасці вітае Вас з высокай узнагародай—надання звання заслужанага дзеяча навукі.

Совет Народных Камісараў упэўнен, што Вы і ў далейшым з такой-жа энергіяй і настойлівасцю будзеце працаваць на карысць нашай соцыялістычнай радзімы і ў гэтай пладатворнай і творчай рабоце Совет Народных Камісараў жадае Вам сіл і здароўя.

Старшыня Совета Народных Камісараў
Беларускай ССР М. ГАЛАДЗЕД.

### Прывітанне Наркомасветы БССР

Прыміце мае шчырыя віншаванні з прычыны прысваення Вам урадам БССР высокага звання заслужанага дзеяча навукі.

Гэтым актам урад БССР засведчыў як высока урад, як і ўся совецкая грамадскасць, ацэньвае Вашу шматгадовую і каштоўную навуковую і выкладчыцкую дзейнасць.

Звыш чатырнаццаці гадоў Вы працуеце ў БССР і Ваша імя непарыўна звязана з гісторыяй вышэйшай школы ў Совецкай Беларусі.

У Вас вучылася не адна сотня совецкіх студэнтаў, якія працуюць зараз у розных кутках Совецкага Саюза і з удзячнасцю ўспамінаюць Вашы лекцыі, якія заўсёды адзначаліся шырокай эрудыцыяй і глыбокім аналізам.

Наркомасветы і ўсё совецкае настаўніцтва высока ацэньвае і Вашу работу, як аўтара падручніка па гісторыі, выкананую Вамі па заданню нашай партыі для сярэдняй школы, па якому вучыцца падрастаючае пакаленне Совецкага Саюза.

Сёння нельга не ўспомніць таксама і Вашу прапагандысцкую работу пад кіраўніцтвам большэвікоў у 1905 годзе і Ваш удзел у стварэнні Міхаілам Нікалаевічам Пакроўскім першай марксісцкай гісторыі Расіі.

Моцна паціскаю Вашу руку і жадаю Вам яшчэ многа гадоў пладатворнай работы. Я ўпэўнен, што Вы пад кіраўніцтвам нашай партыі яшчэ многа карыснага зробіце ў галіне развіцця совецкай навукі і ў дапамозе масавай школе.

Народны Камісар Асветы БССР—Чэрнушэвіч

### Прывітанне БДУ

**Дарагі Нікалай Міхайлавіч!**

Шчыра вітаю Вас з высокай узнагародай—надання Вам звання заслужанага дзеяча навукі. Вы з першых-жа момантаў сваёй навуковай дзейнасці выявілі сябе, як вучоны, для якога была дарага справа пролетарыята. Соцыялістычная Окцябрская рэволюцыя дала усе магчымасці для поўнага разгортвання навуковай работы. Ваша навуковая і педагагічная дзейнасць знаёмы кожнаму студэнту, кожнаму вучню сярэдняй школы Совецкага Саюза.

Вы з'яўляецеся старэйшым і адным з першых навуковых работнікаў БДУ, які паклаў шмат ведаў, энергіі і сіл на работу па арганізацыі універсітэта ў якасці дэкана першага педагагічнага факультэта. З адкрыццем гістарычнага факультэта БДУ у 1934 годзе Вы прышлі на дапамогу новаму факультэту, як прафесар аднаго з асноўных курсаў. Ваша работа на гістфаку мае грамаднае значэнне ў падрыхтоўцы большэвіцкіх гісторыкаў.

Жадаю Вам, паважаны Нікалай Міхайлавіч, доўгай работы на карысць нашай роднай соцыялістычнай радзімы.

Рэктар БДУ—А. Дзьякоў

